Авторские приемы Н. С. Лисовской помогают воплотить в произведениях различные художественные образы, приверженность к национальным традициям, памяти предков и любовь к родному краю, выделяют ее творчество в текстильном искусстве Витебщины. Накопленным опытом художница делится с молодым поколением как преподаватель Витебского государственного технологического университета.


*1.* Кафедра дизайна и моды. Лисовская Наталья Сергеевна [Электронный ресурс] // Витеб. гос. технолог. ун-т. – Режим доступа: https://design.vstu.by/about/staff/lisovskaya-natalya-sergeevna. – Дата доступа: 02.03.2024.

*2. Крывенькая, Алена.* Пад мірным небам / Алена Крывенькая // Мастацтва. – 2024. – № 3 (492). – С. 8–11.

*3. Свистунова, Е. Г.* Этнологический вектор в творчестве белорусской гобеленщицы Натальи Лисовской / Е. Г. Свистунова // Декоративно-прикладное искусство: исторический опыт, современное состояние, перспективы развития : материалы конф., Екатеринбург, 13–15 окт. 2016 г. / Урал. гос. архитектур.-художеств. ун-т ; ред. совет: Ю. С. Янковская [и др.]. – Екатеринбург, 2016. – С. 57–69.



**В. М. Петражыцкая,** *саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».*

Навуковы кіраўнік – **А. Я. Паўлава,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*


# МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ ГАДЗІННІКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў КАЛЕКЦЫЯХ МУЗЕЯЎ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інстытуцыямі, якія захоўваюць памяць у грамадстве, традыцыйна лічацца музеі. Рэчы ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны займаюць важнае месца ў зборы любой музейнай установы. Асаблівую ўвагу мемарыяльным прадметам надаюць краязнаўчыя музеі. Аўтарам даследавання вывучаны фонды 22 раённых музеяў і Мінскага абласнога краязнаўчага музея,

якія на працягу дзесяцігоддзяў папаўняліся матэрыяламі аб жыцці і дзейнасці ўраджэнцаў Міншчыны, прозвішчы некаторых знаёмыя кожнаму жыхару Беларусі. Знайшліся ў фондах і мемарыяльныя гадзіннікі, апісанне якіх дазволіла аднесці іх да асабістых рэчаў ветэранаў вайны.

Адзначым, што 1141 адзінка – агульная колькасць гадзіннікаў у вызначаных музеях па падліках аўтара. Толькі 10 з іх належалі ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Асноўнай формай камплектавання музейных фондаў з'яўляецца добраахвотнае дарэнне фізічнымі асобамі, у выніку ў музейныя калекцыі паступаюць цікавыя і ўнікальныя рэчы, звязаныя з гісторыяй краю і жыхароў. Гадзіннікі як музейныя прадметы ўяўляюць асаблівую гістарычную каштоўнасць і дазваляюць захаваць памяць аб удзельніках і расказаць пра ўрокі вайны, як значнай падзеі XX ст. для Беларусі.

У зборы Слуцкага краязнаўчага музея[1] захоўваецца найбольшая колькасць гадзіннікаў сярод музеяў Мінскай вобласці – 216 адзінак, якія змешчаны ў наступных музейных калекцыях: «Рэчавыя помнікі», «Механізмы. Дэталі механізмаў», «Этнаграфія і побыт», «Нумізматыка». Удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны належалі толькі 6 гадзіннікаў.

Наручны гадзіннік «Победа» (КП 001369) Першага Маскоўскага гадзіннікавага завода выпушчаны да гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў 1946 г. Назву гадзінніка і характарыстыкі зацвердзіў асабіста І. В. Сталін (1945). Каб увекавечыць памяць аб героях савецкага народа, было ініцыявана стварэнне некалькіх праектаў з назвай «Победа», у выніку выпусцілі аднайменныя гадзіннікі і аўтамабілі. «Победа» – імянны гадзіннік М. М. Шуляка, капітана адміністрацыйнай службы, казначэя фінчасткі штаба 3-га Беларускага фронту, кавалера ордэна Чырвонай Зоркі, прыняты ў фонд музея ў 1965 г. і захоўваецца ў калекцыі «Механізмы. Дэталі механізмаў».

Швейцарскі наручны гадзіннік Г. А. Канавалава (КП 001237), камандзіра партызанскага атрада імя С. М. Будзённага брыгады імя А. В. Суворава на Случчыне, перадаланы ў фонд музея ў 1965 г. і знаходзіцца ў калекцыі «Механізмы. Дэталі механізмаў».

---

[1] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы «Слуцкі краязнаўчы музей».

Кішэнны гадзіннік швейцарскай фірмы «Mido» П. Д. Гарбацэвіч (КП 003157/09), ураджэнкі вёскі Кальчыцы Слуцкага раёна, заслужанага ўрача БССР, Героя Сацыялістычнай Працы, захоўваецца ў калекцыі «Рэчавыя помнікі». У гады Вялікай Айчыннай вайны яна была начальнікам санітарнай службы ў партызанскім атрадзе імя С. М. Кірава брыгады імя М. В. Фрунзе на Міншчыне. У 1977 г. П. Д. Гарбацэвіч сама перадала ў музей гадзіннік, з якім прайшла вайну.

Гадзіннік з дароўным надпісам «ад камандавання» І. Ф. Арцёменку (КП 003444/24), камісару партызанскага атрада імя С. М. Кірава брыгады імя М. В. Фрунзе, прыняты ў музейную калекцыю «Рэчавыя помнікі» ў 1981 г.

Адзначым два наручныя гадзіннікі ўраджэнца вёскі Сорагі Слуцкага раёна К. В. Герчыка (1918–2001), савецкага ваеннага, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, другога начальніка касмадрома «Байканур» (1958–1961), ганаровага грамадзяніна г. Байканур, камандуючага ракетнай арміяй СССР [2], які ўзнагароджаны 15 ордэнамі і 29 медалямі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны К. В. Герчык быў камандзірам узвода, батарэі, памочнікам начальніка штаба палка, камандзірам дывізіёна, начальнікам штаба палка і брыгады. Першы наручны гадзіннік «Слава» (КП 014284) прыняты ў калекцыю «Этнаграфія і побыт» у 2001 г., другі наручны гадзіннік «Победа» (КП 016363) з надпісам «50 лет Победы», перададзены ў фонд музея ў 2005 г., увайшоў у калекцыю «Механізмы. Дэталі механізмаў», прадстаўленую ў пастаяннай экспазіцыі музея.

Мінскі абласны краязнаўчы музей[2] валодае багатымі музейнымі фондамі. Сёння ў асноўным фондзе музея – 52 836 музейных прадметаў, з іх 139 – гадзіннікі. Першым у збор музея быў прыняты ў 1961 г. наручны гадзіннік Н. М. Мацісон (КП 000716), ваеннага ўрача 3-га ранга, начальніка санітарнай службы ў партызанскім атрадзе «За Радзіму» брыгады імя М. В. Фрунзе. Н. М. Мацісон сама перадала музею гадзіннік. Мемарыяльны прадмет прадстаўлены ў калекцыі «Прыборы, апараты, механізмы».

[2] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы «Мінскі абласны краязнаўчы музей».

Крупскі гісторыка-краязнаўчы музей валодае невялікай колькасцю гадзіннікаў – 20 адзінкамі[3], якія захоўваюцца ў калекцыі «Гісторыя тэхнікі». У зборы знаходзяцца 2 гадзіннікі ўраджэнца Крупскага раёна, Героя Савецкага Саюза М. Я. Зайцава (1923–2012). Ён нарадзіўся ў сям'і пуцявога абходчыка чыгуначнай станцыі Крупкі, у Чырвонай Арміі з 1941 г., закончыў 3-ю Чкалаўскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў у 1943 г. (г. Арэнбург, Расія), на штурмавіку ў час вайны ажыццявіў 185 баявых вылетаў. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 чэрвеня 1945 г. старшаму лейтэнанту М. Я. Зайцаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». У 1966 г. ён закончыў філасофскае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, абараніў кандыдацкую дысертацыю і выкладаў філасофію [3]. Гадзіннікі М. Я. Зайцава перададзены ў фонд музея ў 2013 г. і з'яўляюцца не толькі мемарыяльнымі прадметамі, але і адметнымі ўзорамі гадзіннікавай вытворчасці. Наручны гадзіннік «Командирские» з дароўным надпісам «30 лет Победы в Великой Отечественной войне от МО 1975» (КП 006631) належыць да юбілейнага выпуску, прымеркаванага да 30-годдзя Перамогі і ўручэння ветэранам вайны. Вытворчасць такіх гадзіннікаў пачалася ў 1965 г. па замове Міністэрства абароны СССР на гадзіннікавым заводзе ў г. Чыстапаль. Узнагародныя гадзіннікі не прызначаліся для шырокага продажу, надпіс «Сделано в СССР» на іх быў заменены на «Заказ МО СССР».

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны перад Першым Маскоўскім гадзіннікавым заводам паўстала задача – распрацаваць гадзіннік для лётнага складу арміі. У 1949 г. выпусцілі гадзіннікі «Штурманские» (назва паводле прафесіі), якія валодалі павышанай трываласцю, эрганамічнасцю і мелі функцыю «стоп-секунда» (магчымасць прыпынку ходу гадзінніка для таго, каб авіягрупа магла сінхранізаваць час і дакладна скаардынаваць дзеянні). У свабодны продаж гадзіннікі «Штурманские» не паступалі. Адзін з названых гадзіннікаў, які належаў М. Я. Зайцаву (КП 006630), сёння захоўваецца ў Крупскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Вядома, што Ю. А. Гагарын у першы касмічны палёт узяў менавіта гадзіннік «Штурманские» [1].

[3] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы культуры «Крупскі гісторыка-краязнаўчы музей».

У калекцыю «Рэчавыя помнікі» Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў[4] у 2004 г. прыняты наручны гадзіннік «Кировские» (КП 001036) гадзіннікавага завода імя С. М. Кірава. Гадзіннік з гравіроўкай «Герою Советского Союза И. К. Захарову от ЦК КПСС и Правительства СССР. В день 20-летия Победы в Великой Отечественной войне 1941–1945 г.» ураджэнец вёскі Ганевічы Лагойскага раёна Мінскай вобласці атрымаў як узнагароду. І. К. Захараў (1909–1982) – Герой Савецкага Саюза, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці, у гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў партызанскай брыгадай імя М. В. Фрунзе. Адна з вуліц у пасёлку Масты Любанскага раёна сёння носіць імя І. К. Захарава [4].

Як мы бачым, мемарыяльных гадзіннікаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў даследуемых калекцыях музеяў Мінскай вобласці няшмат. Усяго ў 4 музеях захоўваюцца рарытэты, якімі можна ганарыцца. На наш погляд, гэта звязана з самім прадметам: гадзіннік – не толькі прыбор для вымярэння часу, але і сімвал. Гадзіннікі, якія сталі ўзнагародай, успрымаюцца як сямейная рэліквія, таму ў калекцыі збораў паступаюць рэдка, а гадзіннікі, якія трапілі ў музей, дазваляюць спазнаць вайну праз лёсы людзей. Нават нешматлікія мемарыяльныя гадзіннікі, захаваныя цяпер у музейных фондах, транслююць велізарны экспазіцыйны і навуковы патэнцыял.

Сёння як ніколі музеям важна арганізаваць работу з нашчадкамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, каб стварыць умовы для перадачы ў музейныя ўстановы мемарыяльных гадзіннікаў ветэранаў і іншых рэчаў, што з’яўляецца гарантыяй іх актуалізацыі музейнымі сродкамі. Такім чынам захаваецца памяць аб людзях і іх гераічных учынках у ваенныя гады.


1. *Барашев, П.* Пять часов с Юрием Гагариным: репортаж с борта самолета «Ил-18» / П. Барашев, В. Песков // Комсомольская правда. – 1961. – 14 апр. – С. 4.

2. Герчык Канстанцін Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн,


[4] Архіў уліковай дакументацыі дзяржаўнай установы культуры «Лагойскі гісторыка-краязнаўчы музей імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў».

1996–2004. – Т. 5 : Гальцы–Дагон / Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 1997. – С. 202.

*3.* Зайцаў Мікалай Якаўлевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 3 : Гімназіі–Кадэнцыя / Г. П. Пашкоў [і інш.]. – 1999. – С. 396.

*4.* Захаров Иван Кузьмич // Их именами названы… : энцикл. справочник / БелСЭ ; редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1987. – С. 231–232.

**К. А. Пилипенко,** *аспирант учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств».*
Научный руководитель – **Ю. П. Бондарь,** *кандидат политических наук, доцент, ректор Государственного учреждения образования «Республиканский институт высшей школы»*

# ОСОБЕННОСТИ ЗАПАДНОЕВРОПЕЙСКИХ СТРАН В СОЗДАНИИ И ФУНКЦИОНИРОВАНИИ КРЕАТИВНЫХ ПРОСТРАНСТВ

В последние десятилетия неотъемлемой частью городской среды являются креативные пространства, которые трансформируются в центры творческой активности и способствуют ревитализации нежилых, покинутых зданий. Их появление пришлось на конец XX в., когда начали использовать территории бывших промышленных предприятий. Такая ситуация связана с ростом стоимости на недвижимость и земельные участки в центре города, что привело к необходимости перемещения промышленных предприятий на окраины. В то же время пустующие площадки бывших промышленных объектов стали притягивать внимание творческих людей.

Принято полагать, что изначально такой способ креативных пространств появился в Великобритании. Примером могут служить галереи Лондона: Alison Jacques Gallery; Barbican Art Gallery; Calvert 22; Camden Arts Centre; Gasworks; Hauser & Wirth; Institute of Contemporary Art; Lisson Gallery; Michael Hoppen Gallery; The Photographers Gallery; South London Gallery; White Cube; Whitechapel Gallery; The Zabludowicz Collection; Serpentine Gallery [4].